# Беларусь-Расія: супрацоўніцтва па нарастаючай

Міністр сувязі і інфарматызацыі Папкоў Сяргей Пятровіч прыме ўдзел у Чацвёртым Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбудзецца 29-30 чэрвеня 2017 года ў Маскве на тэрыторыі ЦПК «Экспацэнтр» і будзе прысвечаны развіццю рэгіянальнага супрацоўніцтва ў сферы высокіх тэхналогій, інавацый і інфармацыйнага грамадства.

Дзелавой праграмай Форуму прадугледжана правядзенне пленарнага пасяджэння, пасяджэння Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве, а таксама шэрагу секцыйных пасяджэнняў з удзелам профільных міністэрстваў і ведамстваў, прадстаўнікоў расійскага і беларускага бізнесу.

Тэматыка адной з секцый - «Супрацоўніцтва расійскіх і беларускіх IT-кампаній на рынках Расіі і Беларусі, а таксама трэціх краін».

Мадэратарамі ад беларускага боку выступяць Папкоў Сяргей Пятровіч, Міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь, і Рахманаў Сяргей Кімавіч, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, а ад расійскага боку - Нікіфараў Мікалай Анатольевіч, Міністр сувязі і масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі,
і Цімчанка Вячаслаў Сцяпанавіч, намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па эканамічнай палітыцы.

У рабоце секцыі прымуць удзел кіраўнікі рэгіянальных органаў дзяржаўнай улады, прадстаўнікі навуковых арганізацый, IT-кампаній дзвюх краін.

Мэтай пасяджэння секцыі № 6 з'яўляецца пашырэнне беларуска-расійскага рэгіянальнага супрацоўніцтва і садзейнічанне ўсталяванню прамых кантактаў паміж рэгіёнамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.
Падчас пасяджэння плануецца разгледзець шэраг пытанняў, у прыватнасці:
1. Агульныя пытанні супрацоўніцтва ў галіне ІКТ;
2. Супрацоўніцтва ў сферы электроннага ўрада;
3. Абмен вопытам па развіццю IT-адукацыі;
4. Развіццё дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў сферы ІКТ;
5. Рашэнні для аптымізацыі дзейнасці дзяржаўнага і камерцыйнага сектараў;
6. Распрацоўка праграмных прадуктаў для дзяржаўнага сектара;
7. Развіццё электроннага гандлю: бягучая сітуацыя, дасягненні, праблемныя пытанні і перспектывы;
8. Абарона крытычнай дзяржаўнай IT-інфраструктуры.

Вынікі пасяджэння секцыі будуць замацаваны ў выніковым дакуменце Чацвёртага Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі.

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/28-06-2017-2088*